Нефядовіч А. В. *(в. Карабы, Глыбоцкі раён)*

ЗАПОЗНЕНЫЯ КВЕТКІ ЯЎГЕНІІ КАНАПЕЛЬКА

72 гады прайшло з дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Але і да гэтага часу пякучым болем адзываецца найцяжэйшая з войнаў у сэрцы кожнага чалавека. Не трэба і перажываць вайну, каб ведаць, што гэта – гора, страты, смерць. Мы не павінны забываць пра жахі вайны, смерць і пакуты мільёнаў людзей. Помніць пра вайну, гераізм і мужнасць тых, хто змагаўся з ворагам і выратаваў ад фашысцкага нашэсця Радзіму – гэта значыць, змагацца за мір. Гэта абавязак усіх, хто жыве на зямлі.

У гады ваеннага ліхалецця загінуў кожны чацвёрты беларус, а на Віцебшчыне – кожны трэці. Не мінула фашысцкая навала і нашу Глыбоччыну. Вайна забрала 13 тысяч 300 нашых землякоў: з іх 1651 чалавек загінуў на франтах і ў партызанскіх атрадах, у вёсках знішчана 346 мірных жыхароў, 183 чалавекі прапалі без вестак, 1245 жанчын засталіся ўдовамі.

На Глыбоччыне пахаваны 192 салдаты Савецкай Арміі, якія загінулі пры вызваленні нашага раёна. У Глыбоцкай зямлі знайшлі апошні прытулак 27 тысяч савецкіх і каля 200 італьянскіх ваеннапалонных з фашысцкіх канцлагераў.

Няма ў нашым раёне ніводнай вёсачкі, дзе б не пакінула свой чорны след вайна. Таму і высяцца сярод азёр і пагоркаў абеліскі. Горкая памяць тых незабыўных дзён – 46 ваенных помнікаў на Глыбоччыне і за кожным з іх – свая гісторыя, свой боль, свая трагедыя.

У 1941 годзе жыхары вёскі Канстанцінава з жахам слухалі зводку пра пачатак вайны — на Беларусь вераломна напалі фашысцкія захопнікі.

Маўчаць, не шапацяць, не гамоняць лісцем ліпы. Калісьці іх было чатыры. Тры яшчэ трымаюцца ў зямлі, хоць ужо выраслі да звону. А чацвёртая збуцвела ад часу.

Пасаджаныя мо два стагоддзі назад дрэвы акаймлялі ўтульную альтанку, да якой вяла шырокая паркавая алея ў маёнтку Канстанцінава. Сюды любілі

прыходзіць усе, хто жыў у палацы пана Акушкі. А ліпы шмат чаго маглі б расказаць…

Вецер часу змёў паноў. У Канстанцінаве, як і ўсюды, пачалі ўсталёўвацца новыя парадкі. Не абмінулі Канстанцінава і змрочныя гады акупацыі. І аднойчы ў той самай альтанцы адбылася жудасная трагедыя, падрабязнасці якой невядомы і па сённяшні дзень.

У Канстанцінаве хадзілі чуткі, што аднойчы ноччу немцы схапілі дзяўчыну, потым замучылі. Аднак пасля вызвалення пра гэта неяк забыліся.

Маўчаць мёртвыя ліпы, пахаваўшы з сабой адну з трагедый Вялікай Айчыннай вайны. Але ці павінна маўчаць людская памяць?

Жэня выхоўвалася ў вялікай сям'і. Бацька меў добры надзел зямлі, на якім і працавалі ўсім сямействам. Геня (так называлі Яўгенію родныя і сябры) расла цікаўнай, бойкай і вельмі прыгожай. А яшчэ яна была спагадлівай і сардэчнай.

Былая сяброўка ўспамінала, што ўсе вельмі любілі Геню. Яна заўсёды дзялілася з сябрамі сваім абедам, умела берагчы сакрэты. Дзяўчаты заўсёды давяралі ёй свае тайны, і Геня ніколі не адкрывала іх. Усе дзяўчаты лічылі за гонар быць яе сяброўкамі, бо Геня была баявой, магла заступіцца за іх, выручыць.

Перад вайной Жэня занявесцілася, ды так расцвіла, што не было адбою ад кавалераў. І нядзіўна: у такую прыгажуню нельга было не закахацца. Але дзяўчына была аднолькава вясёлай з усімі хлопцамі, нікога не выдзяляла з гулідаўскіх кавалераў. Відаць, чакала таго адзінага, які сумеў бы запаланіць яе сэрца. Не дачакалася.

Калі пачалася вайна, Жэні было дзевятнаццаць гадоў. Над Гулідавам, яе роднай вёсачкай, навісла туга і трывога. Пачаліся змрочныя дні акупацыі, і ў Канстанцінаве неўзабаве быў разгорнуты нямецкі гарнізон.

У ваенны час Зянон Курылёнак працаваў майстрам на чыгунцы «Канстанцінава – Круляўшчызна». Ён дакладна памятаў, як да немцаў прыйшла працаваць Жэня Канапелька. Яна была вельмі прыгожай, апраналася як немка, на чорных работах не працавала. Рабочыя чыгункі не паважалі яе, нават ненавідзелі, бо асуджалі яе паводзіны. Жэню, здавалася, такія адносіны не

хвалявалі. Яна была вясёлай і нікольки не саромелася, што людзі думаюць пра яе так дрэнна. Менавіта так вельмі доўга лічылі і многія вяскоўцы. Спробы родзічаў змыць брудную пляму з іх Жэнечкі, заканчваліся беспаспяхова.

Ішлі гады, зажывалі душэўныя раны, нанесеныя вайной, прытупляўся боль страт, адыходзілі жывыя сведкі тых жудасных падзей. Усё радзей і радзей успаміналі ў Гулідаве вясковую прыгажуню Жэнечку Канапельку. І толькі родныя не пераставалі аплакваць яе заўчасную смерць.

На прыканцы 70-х гадоў Пятру Станіслававічу Раловічу надарылася мець гаворку з сястрой Жэні. Успомнілі былое, загаварылі пра вайну. Тады ўпершыню і выказала пажылая жанчына тое, што насіла ў сваім сэрцы не адзін год: «Усіх увекавечылі на помніку загінуўшым землякам, а для нашай Жэні не знайшлося месца».

Гэты папрок балюча запаў і ў сэрца Пятра Станіслававіча, і ён даў сабе слова дакапацца да ісціны, тым больш, што даўно шукаў адказ на пытанне: «Кім жа на самай справе была Жэня Канапелька?»

Пачалася настойлівая пошукавая работа. І вось што ўдалося высветліць. У пастаўскіх лясах дзейнічаў партызанскі атрад імя Суворава. Для яго вельмі важнымі былі звесткі з нямецкага гарнізона, які базіраваўся ў Канстанцінаве. Патрэбны былі разведчыкі і сувязныя. Мясцовыя жыхары падказалі камандзіру атрада Анатолю Сударыкаву, што ў Гулідаве і ёсць дзяўчына, якая справіцца з гэтай работай. Сустрэўшыся з Жэняй, Сударыкаў прапанаваў ёй стаць партызанскай сувязной. Нікольки не раздумваючы, яна дала згоду дапамагаць народным мсціўцам.

Актыўную жыццёвую пазіцыю Яўгеніі Канапелькі пацвердзіць Раловічу ў сваіх успамінах дачка даваеннага старшыні Гулідаўскага сельсавета Валянціна Новікава (дзявочае прозвішча Шчасная). Яна расказала, што ведае Жэню. Бацька Валянціны таксама часта згадваў пра Жэню і казаў, што гэта вельмі актыўная, баявая дзяўчына, завадатар усіх мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў Гулідаўскім клубе, была камсамолкай і не пабаялася стаць сувязной. Былы партызан, жыхар вёскі Залаўкі Мікалай Ліля, расказваў, што Жэня здабывала і прыносіла ў атрад звесткі пра ворага, акрамя таго, дастаўляла глыбоцкім падпольшчыкам міны,

якія перадавалі партызаны. Яна вельмі рызыкавала, бо ведала, што не жаночая гэта справа – вайна. Былы палітрук атрада «Грозны» брыгады імя Варашылава, жыхар вёскі Ляхаўшчына, Мікалай Татун успамінаў, што гэта была вельмі смелая і гордая дзяўчына, калі яна прыходзіла ў атрад, то ўсе ведалі, што Яўгенія прынесла важныя звесткі.

Каб дабыць гэтыя звесткі, Жэня пайшла працаваць да немцаў. Там жа служылі два савецкія разведчыкі. Аднаго звалі Сямён, другога – Васіль. Яны працавалі заадно з Жэняй: перадавалі партызанам праз яе звесткі пра рух паяздоў. Пад покрывам ночы Жэня дабіралася ў атрад, каб тэрмінова перадаць важныя паведамленні. А ўранку, вясёлай, прыгожай, без кроплі стомы, яна павінна была быць у бункерах, дзе размяшчаўся нямецкі гарнізон. Тое, што Яўгенія Канапелька была партызанскай сувязной атрада імя Суворава брыгады імя Варашылава, пацвярджае і пасведчанне, падпісанае камандзірам атрада Сударыкавым, камісарам атрада і начальнікам штаба Чашэнкам. Пасведчанне перадала Раловічу сястра Жэні.

Трапіўся ў рукі і яшчэ адзін дакумент, які пацвярджае, што сям'я Канапелькаў дапамагала партызанам. Гэта даведка за подпісам ужо намесніка камандзіра брыгады імя Варашылава А. Сударыкава. Вось яе змест: «Згодна загада начальніка ваенна-аператыўнага аддзела цэнтра Вілейскай вобласці палкоўніка Маркава, жыхар хутара Гулідава, таварыш Канапелька, вызваляецца ад гаспадарчых паставак для партызанскіх атрадаў. Асобы, якія парушаць загад, будуць прыцягнуты да адказнасці».

Збіраючы гэтыя звесткі, Пётр Станіслававіч крок за крокам набліжаўся да праўды. У пачатку 80-х трапілася ў рукі кніга былога сакратара падпольнага абкама партыі І. Клімава і Н. Гракава «Партызаны Вілейшчыны». У адным з раздзелаў краязнаўца знайшоў пацвярджэнне ўжо сабраных фактаў: «Замучана ў казематах Глыбоцкай турмы партызанская сувязная Яўгенія Канапелька з вёскі Гулідава. Дзяўчына перадала нямала звестак партызанам і памерла як гераіня».

Жыццё Яўгеніі Канапелькі абарвалася летам 1942 года. Росным ранкам яна вярнулася з партызанскага атрада, пераапранула мокрую сукенку і прылягла адпачыць. Каля 11 гадзін раніцы ў хату ўварваліся паліцаі. Адна з сясцёр, якая

была дома, паспела схавацца, а Жэні заламалі рукі, укінулі ў машыну і павезлі, як пазней удалося даведацца родзічам, у глыбоцкую камендатуру.

У казематах глыбоцкай турмы юную сувязную падверглі зверскім катаванням, спрабуючы дазнацца, дзе дыслацыруецца партызанскі атрад, хто з вяскоўцаў падтрымлівае партызан. Яна маўчала, мужна цярпела катаванні. Але юнае сэрца не вытрымала здзекаў. Член падпольнай групы Сабалеўскі, які ведаў Жэню асабіста, раскажа, як закатавалі партызанскую сувязную з Гулідава. Яе прыгожы твар быў так знявечаны, што немагчыма было нават апазнаць. Калі прыехалі ў турму сёстры, каб забраць цела Жэні і адвезці ў Гулідава, немцы не дазволілі. Яны прымусілі разам з трупамі іншых зняволеных адвезці нябожчыцу ў Барок. Там і знайшла свой апошні прытулак дваццацігадовая Яўгенія Канапелька, партызанская сувязная атрада імя Суворава.

Кароткім было жыццё гэтай маладой дзяўчыны. Ніхто не паспачуваў родным, не раздзяліў невыносны боль страты дачкі і сястры. І толькі праз 42 гады, дзякуючы нястомнаму пошуку мясцовага краязнаўцы П.С. Раловіча, была змыта брудная пляма з яго зямлячкі.

9 мая, у Дзень Вялікай Перамогі, і 3 ліпеня, у Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прыйдуць жыхары Карабоўскага сельсавета да помніка землякам, загінуўшым у гады вайны, каб аддаць даніну памяці, ускласці кветкі. Гэта будуць кветкі і для Яўгеніі Канапелькі, якая сустрэла толькі дваццаць вёснаў свайго жыцця.